Источник: **«Звязда» - 2013-10-18**

## Да чэмпіянату — турыстычнае кола

Для ўдзельнікаў і гасцей чэмпіянату свету па хакеі, які пройдзе ў наступным годзе, навукоўцы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прапануюць распрацаваць маршрут “Турыстычнае кола горада Мінска”. Улічваючы напружаны графік спаборніцтваў і тое, што чэмпіянат праводзіцца ў сталіцы, найбольш даступнымі будуць якраз аб’екты Мінска і яго наваколляў, прыводзяць яны слушны аргумент.

Як паведамілі ў прэс-службе НАН Беларусі, навуковай базай для такога праекту з’яўляюцца шматгадовыя даследаванні ў рамках падрыхтоўкі Зводу помнікаў гісторыі і культуры Беларусі, шматтомнага выдання “Гарады і вёскі Беларусі”, а таксама інавацыйныя распрацоўкі па развіцці турызму лакальна-рэкрэацыйнага тыпу.

Аб’ектамі маршрута могуць стаць гарады, помнікі баявой славы, аб’екты гісторыка-культурнай спадчыны — Заслаўе, гісторыка-культурны комплекс “Лініі Сталіна”, гарадзішча на рацэ Менцы, Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і быту, сядзіба Чапскіх у вёсцы Прылукі, музейны комплекс “Дудуткі”, мемарыяльныя комплексы “Трасцянец” і ў вёсцы Студзёнка, Купалаўскія мясціны (“Акопы”, “Вязынка”), гарналыжныя комплексы “Сілічы”, “Лагойск” і іншыя аб’екты.

Па меркаванні навукоўцаў, стварэнне такога маршрута не толькі дазволіць пазіцыянаваць славутасці наваколляў Мінска, але і стварыць новы прыцягальны турыстычны брэнд.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**